ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Бюро Прэзідыума
Нацыянальнай акадэміі
навук Беларусі
16.03.2020 № 96

# ПАЛАЖЭННЕ
аб нагрудным знаку “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі “За дасягненні ў навуцы”

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Нагрудны знак “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі “За дасягненні ў навуцы” (далей – Сярэбраны медаль) з’яўляецца ўзнагародай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прызнаннем заслуг узнагароджанага перад навукай і грамадствам.

2. Сярэбраным медалём узнагароджваюцца айчынныя і замежныя вучоныя, дзяржаўныя, грамадскія дзеячы за:

значныя дасягненні ў даследаваннях і распрацоўках, паспяховую рэалізацыю перспектыўных навукова-тэхнічных праектаў;

плённую дзейнасць па ўмацаванні навукова-тэхнічнага патэнцыялу краіны, павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў, інавацыйнай дзейнасці;

асабісты ўклад у пашырэнне міжнародных навуковых сувязей і ўмацаванне міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва;

значныя дасягненні ў галіне падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі.

3. Рашэнне аб узнагароджанні Сярэбраным медалём прымаецца пастановай Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на аснове разгляду матэрыялаў прадстаўлення кандыдатуры да ўзнагароджання.

4. Сярэбраны медаль носіцца справа пасля ордэнаў і медалёў, а пры іх адсутнасці – на іх месцы.

5. Паўторнае ўзнагароджанне Сярэбраным медалём не дапускаецца. Пры згубе Сярэбранага медаля дублікат не выдаецца.

## ПРАДСТАЎЛЕННЕ ДА ЎЗНАГАРОДЖАННЯ СЯРЭБРАНЫМ МЕДАЛЁМ

6. Права хадайнічаць аб узнагароджанні Сярэбраным медалём маюць:

арганізацыі і грамадскія аб'яднанні, якія зарэгістраваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Вылучэнне кандыдатур на ўзнагароджанне Сярэбраным медалём арганізацыямі і грамадскімі аб'яднаннямі ажыццяўляецца на пасяджэннях вучоных (навуковых, навукова-тэхнічных) саветаў або на сходах калектываў работнікаў і афармляецца пратаколам;

аддзяленні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

члены Бюро Прэзідыума і кіраўнік апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

7. Арганізацыі, якія вылучылі кандыдатуры на ўзнагароджанне Сярэбраным медалём, за 1 месяц да меркаванай даты ўзнагароджання накіроўваюць у Нацыянальную акадэмію навук Беларусі наступны камплект дакументаў:

суправаджальнае пісьмо па форме згодна з дадаткам 1;

выпіску з пратакола пасяджэння вучонага (навуковага, навукова-тэхнічнага) савета або схода калектыва работнікаў;

прадстаўленне да ўзнагароджання Сярэбраным медалём на кожную асобу, якая прадстаўляецца да ўзнагароджання, па форме згодна з дадаткам 2;

спраўку-аб'ектыўку на кожную асобу, якая прадстаўляецца да ўзнагароджання;

копію старонкі 31 пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь на кожную асобу, якая прадстаўляецца да ўзнагароджання.

8. Хадайніцтвы аб узнагароджанні Сярэбраным медалём разглядаюцца ў наступным парадку:

аб узнагароджанні работнікаў арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і замежных грамадзян – аддзяленнямі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па прадстаўленні арганізацый, якія замацаваны за аддзяленнямі;

аб узнагароджанні работнікаў арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія не замацаваны за аддзяленнямі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, – намеснікам Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, які курыруе гэтыя арганізацыі, па прадстаўленні арганізацый;

аб узнагароджанні асоб, якія працуюць у арганізацыях іншай ведамаснай падначаленасці або грамадскіх аб'яднаннях, – аддзяленнямі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў адпаведнасці з галіной навукі або членамі Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія курыруюць адпаведныя напрамкі дзейнасці, па прадстаўленні гэтых арганізацый (грамадскіх аб'яднанняў);

аб узнагароджанні кіраўнікоў і работнікаў структурных падраздзяленняў апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – членамі

Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія курыруюць гэтыя падраздзяленні, па прадстаўленні кіраўніка апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

9. Структурныя падраздзяленні і службовыя асобы апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія зазначаны ў пункце 8 дадзенага Палажэння, абавязаны праверыць абгрунтаванасць прадстаўлення да ўзнагароджання і накіраваць у Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі разам з дакументамі вылучэння ад арганізацыі сваё рашэнне аб узнагароджанні з матываваным абгрунтаваннем.

10. Праект пастановы Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб узнагароджанні Сярэбраным медалём рыхтуе структурнае падраздзяленне апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якое адказвае за прадстаўленне да ўзнагароджання (заахвочвання) дзяржаўнымі і ведамаснымі ўзнагародамі (заахвочваннямі).

## УРУЧЭННЕ СЯРЭБРАНАГА МЕДАЛЯ

11. Уручэнне Сярэбранага медаля праводзіцца ва ўрачыстых абставінах Старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі або па яго даручэнні намеснікам Старшыні Прэзідыума, галоўным вучоным сакратаром, акадэмікам-сакратаром, іншым членам Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

12. Разам з Сярэбраным медалём уручаецца пасведчанне да яго (Пасведчанне да нагруднага знака “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ”За дасягненні ў навуцы”), якое афармляецца на беларускай мове і змяшчае прозвішча, імя, імя па бацьку ўзнагароджанага, указанне на дату і нумар пастановы Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб узнагароджанні. У асобных выпадках пры уручэнні Сярэбранага медаля замежнаму грамадзяніну пасведчанне да Сярэбранага медаля можа афармляцца на замежнай мове.

Пасведчанне да Сярэбранага медаля падпісвае Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, або асоба, якая выконвае яго абавязкі.

Пры згубе пасведчання да Сярэбранага медаля можа быць выдадзены яго дублікат на падставе заявы ўзнагароджанага.

13. Работнікам апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, узнагароджаным Сярэбраным медалём, выплачваецца грашовая частка ў памеры шасці базавых ставак (памер базавай стаўкі вызначаецца на дату прыняцця пастановы Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб узнагароджанні Сярэбраным медалём) за кошт бюджэтных

сродкаў, якія прадугледжаны на аплату працы па каштарысе апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Работнікам арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, узнагароджаным Сярэбраным медалём, выплачваецца грашовая частка ў памеры шасці базавых ставак (памер базавай стаўкі вызначаецца на дату прыняцця пастановы Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб узнагароджанні Сярэбраным медалём) за кошт сродкаў гэтых арганізацый.

Пытанні матэрыяльнага заахвочвання іншых асоб вырашаюцца па месцы іх асноўнай працы.

14. Персанальны ўлік узнагароджаных Сярэбраным медалём вядзе структурнае падраздзяленне апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якое адказвае за прадстаўленне да ўзнагароджання (заахвочвання) дзяржаўнымі і ведамаснымі ўзнагародамі (заахвочваннямі).

15. Запіс аб узнагароджанні Сярэбраным медалём уносіцца ў працоўную кніжку работніка.

Дадатак 1
да Палажэння аб нагрудным знаку “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі “За дасягненні ў навуцы”

Суправаджальнае пісьмо (узор)

“____” ____________ 20__ г.

Бюро Прэзідыума
Нацыянальнай акадэміі
навук Беларусі

Аб прадстаўленні Івановай І.І. да ўзнагароджання нагрудным знакам “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі “За дасягненні ў навуцы”

На пасяджэнні вучонага савета дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут _________ Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” (пратакол ад ___________20__ г. № ___) кандыдатура Івановай І.І. вылучана для прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі “За дасягненні ў навуцы” за распрацоўку і вытворчае асваенне комплексу высокаэфектыўных тэхналогій вырабу харчовых дабавак новых структур, якія забяспечваюць канкурэнтаздольнасць айчыннай сельскагаспадарчай прадукцыі шырокага спектра прызначэння.

Дадатак: 1. Выпіска з пратакола пасяджэння _____ на 1 с. у 1 экз.
2. Прадстаўленне на 2 с. у 1 экз.
3. Спраўка-аб’ектыўка на 1 с. у 1 экз.
4. Копія старонкі 31 пашпарта на 1 с. у 1 экз.

Дырэктар ДНУ “Інстытут _________
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” В.В.Васільеў

Дадатак 2
да Палажэння аб нагрудным знаку “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі “За дасягненні ў навуцы”

Форма

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**
**да ўзнагароджання нагрудным знакам “Сярэбраны медаль Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі “За дасягненні ў навуцы”**

1. **Прозвішча, імя, імя па бацьку** (у адпаведнасці з пашпартам)
________________________________________________________________

2. **Пасада, месца працы, службы** (назва арганізацыі адпаведна зарэгістраванаму статуту) ______________________________________

3. **Вучоная ступень, вучонае званне** ______________________________

4. **Асаблівыя заслугі, за якія прадстаўляецца да ўзнагароды (кароткая фармуліроўка):** за распрацоўку і ўкараненне ў вытворчасць высокаэфектыўных тэхналогій стварэння новых кампазіцыйных матэрыялаў, плённую навуковую і навукова-арганізацыйную дзейнасць

5. **Інфармацыя аб асабістых дасягненнях** __________________________

Кіраўнік арганізацыі ____________________________________
(подпіс, ініцыялы, прозвішча)

“ ___ “_____________ 20___ г.